ГЦБС г. Гродно

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная
сістэма г. Гродна»
Аддзел бібліятэчнага
маркетынгу ЦБ імя А.Макаёнка



# Быць прыродзе сябрам

## Аб вопыце работы дзіцячых клубаў «Пралеска» і «Мурашы» па экалагічным выхаванні дзяцей і падлеткаў.

2014

**Быць прыродзе сябрам: аб вопыце работы дзіцячых клубаў “Пралеска” і “Мурашы” па экалагічным выхаванні дзяцей і падлеткаў / ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна”; аддзел бібліятэчнага маркетынгу ЦБ імя А.Макаёнка; уклад. Т.А. Шыбут; рэд. Н.Ю. Баброва. – Гродна, 2014. – 14 с.**

Грамадства ўжо зразумела, што чалавек з'яўляецца не царом прыроды, а яе складовай часткай. Але той часткай, якая аказвае найбольшы ўплыў на сучаснае становішча навакольнага асяроддзя і развіццё ў будучым. Разуменне гэтага трэба з маленства прывіваць і дзецям, калі душа маленькага чалавека яшчэ як ніколі набліжана да прыроды, калі яркім полымем гарыць цікавасць да усяго навакольнага. Разумеючы важнасць дзяцінства як найбольш спрыяльнага ўзросту для выхавання паважлівага стаўлення да прыроды, пры бібліятэках і былі створаны экалагічныя клубы.



Фота 1 Дзямешчык Н.Я.

У сакавіку **1998 года** пры бібліятэцы № 6 пачаў сваю дзейнасць экалагічны дзіцячы клуб **"Пралеска"**. Першымі ўдзельнікамі яго сталі вучні 4-х класаў гімназіі № 7, а кіраўніком клуба была Дзямешчык Наталля Яўгенаўна. Таксама ў свой час дзейнасць клуба арганізоўвалі Шаўчэнка Людміла Уладзіміраўна, Прыходзька Наталля Іванаўна, а з пачатку 2014 года гэтая роля належыць загадчыку бібліятэкі Ціхановіч Галіне Рамуальдаўне.



Фота 1 Н.А. Прыходзька

Дэвізам клуба абраны словы В.М. Пяскова *"Будзь міласэрны, Чалавек! Ва ўсіх людзей адна планета!"* У клуба ёсці і свая песня - "Пралеска" (сл. А. Дзеружынскага, муз. У. Галя). У сваёй дзейнасці клуб кіруецца шэрагам прынцыпаў:

- *Прынцып адзінства* - усе мы з'яўляемся часткай прыроды.
- *Прынцып павагі да прыроды* - кожная жывая істота мае права на жыццё.
- *Прынцып супрацоўніцтва* - наша роля заключаецца ў разуменні і супрацоўніцтве з прыродай, а не ў яе заваёўванні.
- *Прынцып аховы прыроды* - нельга чалавеку быць прычынай знікнення якіх-небудзь відаў, існуючых у прыродзе.
- *Прынцып "Любі свой край"* - вывучайце і любіце прыроду роднага краю, жывіце ў міры і згодзе з ёю.

Маладзейшым усяго на паўтара года з'яўляецца клуб **"Мурашы"**, які дзейнічае з верасня 1999 года пры аддзеле абслугоўвання дзяцей Цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка. У верасні гэтага года "Мурашам" споўніцца 15 год! Заснавальнікам клуба і яго кіраўніком была Ірына Мікалаеўна Уласава, тагачасны загадчык цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі. Далей на працягу 10 год клубам кіравала Чэбатарэвіч Наталля Вітальеўна. Пасля кіраўніком клуба стала Саўчыц Вольга Вячаславаўна, а зараз гэтую працу вядзе Хацук Наталля Сяргееўна. Удзельнікамі клуба з'яўляюцца дзеці 8-11 гадоў. Усе мерапрыемствы накіраваны на тое, каб навучыць дзяцей любіць і берагчы прыроду, жыць з ёй у



Фота 2 Н.В. Чэбатарэвіч

згодзе. Для дасягнення гэтай мэты выконваюцца наступныя задачы:

- папулярызацыя прыродазнаўчай літаратуры;
- навучанне дзяцей назіраць за прыродай, разбірацца у яе з'явах, іх узаемасувязі;
- выхаванне ў чытачоў разумення неабходнасці аховы прыроды;
- выпрацоўка асабістай адказнасці кожнага школьніка за захаванасць навакольнага асяроддзя.

Дэвіз клуба - *"Вывучай, захоўвай, памнажай"*. У клуба ёсць і свае дасягненні. Так, члены клуба удзельнічалі у ІІ рэспубліканскім аглядзе-конкурсе па экалагічнай адукацыі і інфармаванню насельніцтва у 2000-2001 гг. і былі адзначаны дыпломам 1 ступені у намінацыі "Лепшая дзіцячая бібліятэка".

Важнае месца у дзейнасці абодвух клубаў займае рэалізацыя сумесных праграм.

Так, у 2005 аддзелам бібліятэчнага маркетынгу Гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка была распрацавана праграма "Прывядзем у парадак шар зямны", да якой далучыліся Гродзенскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Гродзенскі дзяржаўны абласны эколагабіялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва, Гродзенскі заалагічны парк і гарадская паліклініка № 2. Праграма рэалізоўвалася на працягу 2005-2006 гадоў. Мэтай праграмы з'яўлялася стварэнне неабходных умоў у



Фота 3 "Залатая восень"

бібліятэках для фарміравання у чытачоў экалагічнай культуры, выхаванне здаровага ладу жыцця.

Мерапрыемствы ў рамках праграмы былі цікавымі і насычанымі. Успомніць толькі гульню-аўкцыён "Паспяшайся на кірмаш" у клубе "Мурашы", на якую завітала сама Залатая восень. Дзеці чыталі вершы, адгадвалі загадкі, знаёміліся з асаблівасцямі восеньскіх свят, а разам з кіраўніком гуртка дзіцячага цэнтра "Прамень" Генюш В.Ю. навучыліся рабіць з цеста, пластыліна, прыродных матэрыялаў цікавыя вырабы. Напрыканцы свята ўсе атрымалі ад гаспадыні-Восені духмяныя яблыкі.

Таксама запамінальным стала наведванне Гродзенскага заапарка. Кожнае пакаленне дзяцей з захапленнем разглядае яго насельнікаў, адкрывае для сябе па-новаму свет жывёл, тым больш экзатычных.

А вось значэнне аховы жывёльнага і расліннага свету дзеці даведаліся падчас прэм'еры адной кнігі "Чырвоная кніга у вершах і аповесцях беларускіх пісьменнікаў". Чаму менавіта чырвоны колер абраны для гэтай кнігі і што неабходна рабіць, каб захаваць рэдкія і знікаючыя віды жывёл і раслін у іх прыродным асяроддзі, а не на старонках кніг - былі асноўнымі пытаннямі для абмеркавання.

Удзельнікі санітарнага рэйду "Там чыста, дзе не смецяць" на справе выказвалі сваё стаўленне да аховы прыроды.

"Восенскія пасядзелкі" прайшлі ў вясёлым і пазнавальным баўленні часу. Падчас мерапрыемства былі падведзены вынікі конкурсу ў трох намінацыях на тэму восені: лепшы малюнак, лепшы верш і лепшы выраб.

Запамінальнымі сталі тэатралізаваныя прадстаўленні. Адно з іх - "Гісторыя вадзяной кропелькі" было прысвечана такой неабходнай для усяго жывога з'яве, як вада. Напрыканцы года адбылося тэатралізаванае свята "Зімушка-зіма". Разам з Дзедам Марозам і Снягуркай дзеці вадзілі каргоды,

удзельнічалі ў конкурсах і віктарынах, і, вядома, атрымалі ад іх смачныя пачастункі.

Своеасаблівым вынікам працы стаў брэйн-рынг па творах пісьменнікаў-прыродазнаўцаў. За час працы клуба хлопчыкі і дзяўчынкі прачыталі шмат твораў Чарушына, Біянкі, Паустоўскага, Акімушкіна і інш. Мерапрыемства было арганізавана як турнір паміж дзвюма камандамі. Ён складаўся з некалькіх займальных спаборніцтваў: "Лясные жмуркі", "Чахарда зляснымі жывёламі", "Звярыныя хованкі". А пераможца выйшаў адзін - прырода, бо немагчыма нанесці шкоду навакольнаму асяроддзю, калі столькі ведаў знойдзена на старонках прачытаных кніг.

2007 год у клубе "Пралеска" быў вельмі насычаны на гульнёвыя праграмы. На адным з першых пасяджэнняў прайшла конкурс-гульня "Мой ласкавы і пяшчотны звярок". Акрамя пытанняў выктарыны, у якой, дарэчы, дзеці з задавальненнем удзельнічалі, была арганізавана выстава фотаздымкаў з хатнімі любімцамі. Пазней прайшла гульня-віктарына "Птушкі роднай Беларусі". І, вядома, не абыйшлося без вясёлых конкурсаў і гульняў навагодняе свята. Тым больш, што арганізавалі іх прыгажуня Прынцэса, Баба Яга і Дзед Мароз са Снягуркай.



Фота 4 Навагодняе свята ў клубе "Пралеска"

Праграмная дзейнасць клубаў на гэтым не спынілася. Так на 2008-2009 гады была распрацавана новая праграма супрацоўніцтва "Гэта зямля - твая і мая" разам з Гродзенскім заалагічным паркам, сярэднімі школамі № 6 і № 13. Шмат цікавага і займальнага было прадугледжана праграмай.

Напрыклад, экалагічны КВЗ у клубе "Мурашы". У час яго былі прадэманстраваны не толькі веды, але і артыстызм і уменне працаваць у камандзе.

Загадзя ўдзельнікі клуба рыхтаваліся да поля цудаў "Возмем пад ахову: рэдкія расліны і жывёлы". Дзеці падзяліліся на групы і складалі крыжаванкі, рэбусы, шарады, а таксама падрыхтавалі вялікую колькасць загадак і пытанняў для сваіх равеснікаў.

Клуб "Пралеска" на сваіх пасяджэннях таксама надаў значную ўвагу раслiннаму свету. З поспехам прайшлі экалагічная гадзіна "Кветцы, травінцы кожнай сябрам будзь..." і пазнавальная гадзіна "Дрэва майго жыцця". На абодвух мерапрыемствах удзельнікі прадстаўлялі свае фотаздымкі.

А ўзімку дзятва клуба "Мурашы" на справе дапамагала птушкам. Былі пабудаваны і размешчаны кармушкі.



Фота 5 Экскурсія клуба "Мурашы" на "Гроднавадаканал"

У 2010 годзе дзейнасць праграмы "Гэта зямля - твая і мая" была працягнута. Зноў прайшла чарга захапляльных мерапрыемстваў: пазнавальныя гульні-віктарыны, экалагічныя і літаратурныя гадзіны, экалагічны конкурс. З нагоды юбілеяў прайшлі літаратурныя вечары "Планета цудаў Мікалая Сладкова" да 90-годдзя з дня нараджэння пісьменніка і "Што я бачыў..." да 75-годдзя кнігі "Рассказы о животных" Б. Жыткова (клуб "Мурашы"), экалагічная прэзентацыя "Беражы свой дом" да 85-годдзя з заснавання Бярэзінскага біясфернага запаведніка (клуб "Пралеска"). Традыцыйным для клуба "Мурашы" стала

правядзенне штогод экалагічнага КВЗ. А ў клубе "Пралеска" прайшоў экалагічны конкурс "Экалогія і здароўе". Удзельнікі падзяліліся на тры каманды і актыўна прымалі ўдзел ў гульнях, адгадвалі загадкі і адказвалі на пытанні віктарыны, разгадвалі крыжаванку і нават паспрабавалі імітаваць журчанне вады. Шмат усмешак і добрага настрою клубаўцам падаравалі і навагоднія святы.

З 2012 года пачалася рэалізацыя праграмы "Зялёная планета", якая была падпісана з Гродзенскай гарадской інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а ў 2013 годзе - з Орхускім цэнтрам г. Гродна. У час дзейнасці праграмы была арганізавана незвычайная экскурсія на ДУКПП "Гроднавадаканал" для ўдзельнікаў клуба “Мурашы”.

Працягваецца супрацоўніцтва і з Гродзенскім заалагічным паркам. Яго супрацоўнікі з'яўляюцца частымі гасцямі на пасяджэннях клуба "Мурашы". Пры такіх сустрэчах яны пазнаёмілі і больш падрабязна расказалі пра жыццё хамякоў, чарапах, вужоў.



**Фота 6 Заапарк у гасцях у "Мурашоў" 2014 год**

Заўсёды з вялікім задавальненнем у клубах адзначаюцца міжнародныя экалагічныя святы - Міжнародны дзень Зямлі, Міжнародны дзень птушак, Сусветны дзень аховы жывёл.

Усяго за гады дзейнасці ў кожным клубе прайшло больш за 130 пасяджэнняў. Усе яны знайшлі водгук у душах дзяцей, і, несумненна, паўплывалі на іх стаўленне да прыроды. Справа выхавання беражлівых адносін да навакольнага свету, аховы

прыроднага багацця працягнецца і ў будучым. Жадаем усім удзельнікам займальных і цікавых урокаў ад самой маці-прыроды.

**Дадатак 1**

## *Сценарий познавательной игры-викторины "Солнце светит всем"*

*Заседание клуба “Мурашы”*

ВЕДУЩИЙ: Здравствуйте, ребята! Задумывались ли вы, почему так часто писатели, поэты, художники в своём творчестве обращаются к природе? В ней они находят созвучие своим мыслям, настронению, в ней черпают вдохновение.

Почему же мы зачастую равнодушно скользим взглядом по пейзажу, изоброжённому знаменитым художником, стараемся, не читая, перелистать страницы с описанием природы в книге известного писателя, обходим вниманием стихи о природе? А часто ли мы любуемся красивым видом реки, леса, ночного озера?

Древние люди покланялись матушке-природе. Они понимали, что полностью зависят от неё. Человек тогда очень чётко понимал, что Земля его поит, кормит, обучает, одевает, веселит и карает. Но постепенно человек стал отгораживаться от окружающего мира.

Действительно всё чаще мы видим неухоженные поля, горы мусора, загрязнённые реки, высохшие озёра, вырубленные леса. Мы дышим отравленным воздухом и едим отравленные "удобрением" овощи и фрукты.

Поэтому сегодня мы немного поиграем с вами и заодно узнаем какие вы наблюдательные и что вы знаете об окружающем мире. Победа в игре обеспечена тем, кто умеет внимательно читать журналы и газеты о природе, смотреть и слушать теле- и радиопередачи, посвящённые ей, а также логически думать. Сейчас мы поделимся на две команды. Вам необходимо выбрать капитана команды и придумать ей название. За каждый правильный ответ в конкурсе команда получает жетон.

**РАЗМИНКА**

**Задача "Три дерева"**

Посмотрев на рисунки, объясните, какое дерево росло в густом лесу, какое - в открытом поле, а какое - в городе.




*(Пышная, раскидистая крона у дерева, выросшего в открытом месте (1); в тёмном лесу выросло дерево высокое и узкое (2) - оно тянулось к свету; городское же дерево (3) было подвержено всяческим вредным воздействиям, поэтому оно неровное и чахлое).*

**Задача "Три птицы"**

По форме клюва определите, чем питается птица - жучками и червячками, плодами и косточками или мясом.




*(Узкий и длинный клюв (1) помогает птице добывать насекомых из трещин и щелей; короткий и прочный (2) позволяет раскалывать твёрдые семена и орехи; у хищных птиц (3) клюв крепкий, изогнутый, чтобы отрывать куски мяса).*

**ПЕРВЫЙ КОНКУРС.**

Каждой команде для опознания даются рисунки листов разных растений. Задача игроков - не только назвать растения, но и вспомнить, какую пользу они приносят. За каждый опознанный листочек команды получают по одному жетону, а также за полезное свойство данного растения.

**Задание для первой команды:**




БЕРЁЗА - не только самое поэтическое дерево! Её сок - источник витаминов, экстракты используются в медицине и в парфюмерии (изготовление лосьонов); берёзовая кора в старину шла вместо письменной бумаги; дёготь использовался как универсальная смазка, а "берёзовая каша", говорят, весьма способствовало обучению и воспитанию подрастающего поколения.

МАЛИНА - потогонное, противовоспалительное, обезболивающее средство, необходимое при простуде, гриппе, ревматизме; используется также при лечении желудочно-кишечных заболеваний и даже сахарного диабета; отвар цветов малины - хорошее средство для ухода за кожей.

ЧЕРНИКА - используется как вяжущее и противовоспалительное средство; ягоды полезны для восстановления зрения и лечения кожных заболеваний; листья входят в состав лекарств, помогающие при заболеваниях почек, суставов, желудка.

ЛАНДЫШ - кардиотоническое средство. Кроме того, его ароматные экстракты входят в состав различных парфюмерных средств.

**Задание для второй команды:**

2



ЛИПА - даёт поделочную древесину (мебель, посуда); отвар липового цвета - потогонное, противовоспалительное, успокаивающее средство; почки и листья применяются при лечении ран, язв, ожогов. Можно вспомнить про липовый мёд и лапти из лыка.

ШИПОВНИК. Плоды его - источник витаминов; лекарственные средства из шиповника помогают лечению инфекций, астмы, заболевания печени, язвы желудка, ожогов и воспалений.

ЗЕМЛЯНИКА - тонизирующее и противовоспалительное средство; земляникой лечат авитаминоз, заболевание почек, сердца и сосудов, суставов, а также туберкулёза.

РЕПЕЙНИК, он же лопух, не так уж красив, но его корень входит в состав болеутоляющих, антимикробных средств. И, между прочим, благодаря репейнику была изобретена универсальная застёжка "велькро" - удобнейшая липучка.

**ВТОРОЙ КОНКУРС.**

Это конкурс капитанов. каждому капитану даётся стихотворение о природе, которое они должны выразительно прочесть и сказать, что полезного он из него вынес. Пока капитаны готовятся с остальными участниками команды проводится викторина. За каждый правильный ответ команда получает жетон.

**ВИКТОРИНА.**

1. Кто на себе свой домик носит? (Улитка, черепаха)
2. Кто из птиц вместо гнёзд роет норы? (Зимородок, ласточка-береговушка, сизоворонка)
3. Какие птицы сами говорят, как их зовут? (Галка - "Галя", кукушка - "Ку-ку", пищуха всё время попискивает)
4. Кто ногами слышит? (Кузнечик)
5. Зелёный поясок в траве затерялся. Кто это? (Ящерица, гусеница)
6. Мастер шубу себе сшил, а иглу вынуть забыл. Кто это? (Ёрш, ёж)
7. Всех за день навещу, всё что знала, сообщу. Кто я? (Сорока)
8. Зверь я горбатый, а нравлюсь ребятам. Кто я? (Верблюд)
9. Меньше тигра, больше кошки, над ушами кисти-рожки, страшен в гневе этот зверь. Кто это? (Рысь)
10. Кто по мшистой мокрой тропке, словно мячик скачет ловкий? (Лягушка)

11. Голубой аэропланчик сел на белый одуванчик. Кто это? (Стрекоза)

**ТРЕТИЙ КОНКУРС "ШИФРОГРАММА"**

Командам раздаются шифрограммы, в которых зашифрованы названия рассказов о животных. Необходимо расшифровать название и сказать кто написал этот рассказ.

*Ответы первой команды:* Геннадий Снегирёв "Скворцы", Георгий Скребицкий "Наседка", Максим Горький "Воробьишко".

*Ответы второй команды:* Антон Чехов "Каштанка", Дмитрий Мамин-Сибиряк "Приёмыш", Виталий Бианки "Хвосты".

***Первая команда***

GEDJWCVNLYLIYURKWRFDSBZVLSSVGJLIUOVFGUYURYRJLPSVGFFVZЦQWDFWSDFЫYJLW

DLYURNVHVZUWRQGSDLJANVJLWQYUICNVJGFEQWQRYUILJNДVJNFUIRZSDFKGQWRUALJIF

DLJIUYWBZJSDFWUIYQJOLSDZGYUZSPQLJIRYVONGLIJNRБZWSDЬRWDGИNUIYШNJISKWZNOF

***Вторая команда***

SZLNJUIKQZDFGYRJAWNVGFUIDШWUYNVZLJITSDFGJLNVZAIEUYWHNVRUFZKQLAJGASD

DUINVПJLTYRFPVSZUJFGDSWИLJNVZЁWSDGYFIMVNYUЫIJNVZYUSFRDQLJGNШVDFSWRLU

VJLYUXGFRWSNBZDFSUIXNVDGSRBQIUSGDOSZNVGLJUIRWQSDFGJLNVZCLJUQRTWRYUFDGЫDJLN

**ЧЕТВЁРТЫЙ КОНКУРС "ЗНАКИ"**

Для охраны природы перед въездом в городские лесопарки обычно ставят знаки. Расскажите, что обозначают представленные вам знаки.

***Первая команда***

1



*"Въезд запрещён"* - в лесопарке нет дорог для автомобилей, а проезжая по траве, можно сгубить много маленьких насекомых.

*"Разведение костра запрещено"* - от костра может возникнуть пожар в лесу. Для "заживления" кострища требуется 15-20 лет.

*"Выгул собак запрещён".* Часто в лесопарках гуляют дети, а собаки могут их напугать.

*"В лесу старайся ходить по тропинке".* Народная мудрость гласит: один человек оставляет в лесу след, а сто человек - тропу, а тысячи - пустыню.

*"Не ломай ветки деревьев и кустарников".* Растение - живое существо, и ветки вместе с листьями помогают ему дышать, задерживают пыль. Не случайно там, где много растений легко дышать.

***Вторая команда***

2



*"Оставлять бутылки и распивать спиртные напитки запрещено".*

*"Включать музыку на полную мощность, поднимать шум и гам нельзя".* От этого звери и птицы покидают свои гнёзда и норы, птенцы не поспевают за взрослыми, теряются и нередко гибнут. Не могут подняться в небо шмели, пчёлы и другие

насекомые. Нужно ценить и охранять тишину.

*"Не рви цветы на лугу и в лесу".* Цветок в вазе - это пленник, приговорённый к скорой смерти. Именно наша давняя привычка срывать цветы привела к исчезновению многих видов растений.

*"Не сбивай грибы даже несъедобные".* Часто человек, проходя по лесу, сшибает мухоморы, валуи. Тот, кто так поступает, не уважает лес, не понимает и не любит его. Мухоморы помогают расти деревьям. Ими питаются белки, лоси, сороки. Многие грибы участвуют в разложении растительных останков в лесу: разрушат пни, поваленные стволы, отмершую листву. Они - санитары леса!

*"Отдыхая в лесу не оставляй после себя беспорядок".* Помните: брошенная бумага разлагается два года, консервная банка - не менее семидесяти лет. Оставленный вами полиэтиленовый пакет будет лежать несколько веков, так как нет на Земле бактерий, которые могут его разрушить. А осколки банки или бутылки способны, как мины, "сработать" даже через тысячу лет. В солнечную погоду осколок стекла способен сыграть роль линзы и вызвать лесной пожар.

Укладальнік Шыбут Т.А.